## ХРОНИКА НАУЧНОЙ ЖИЗНИ

### XXVII МІЖНАРОДНЫЯ ГАРЭЦКІЯ ЧЫТАННІ «МАКСІМ І ГАЎРЫЛА ГАРЭЦКІЯ. ЖЫЦЦЁ І ТВОРЧАСЦЬ»

(Мінск, 6 чэрвеня 2019 года)

У гэтым годзе Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры, Рэспубліканскі фонд братоў Гарэцкіх і Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ладзілі міжнародную навукова-практычную канферэнцыю «XXVII Міжнародныя Гарэцкія чытанні». Мерапрыемства было прысвечана 100-годдзю выхаду ў свет знакавай для творчасці М. Гарэцкага аповесці «Дзве душы» і 90-годдзю афіцыйнага надання Гаўрылу Гарэцкаму звання акадэміка Беларускай Акадэміі навук.

З уступным словам да ўдзельнікаў мерапрыемства звярнуўся М. Рыбакоў – дырэктар Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, з прывітальным словам выступілі П. Латушка – генеральны дырэктар Дзяржаўнай установы «Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы» і А. Бутэвіч – пісьменнік, старшыня Грамадскай назіральнай камісіі пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь па ахове гісторыка-культурнай спадчыны.

Праблемнае поле канферэнцыі ўключала наступныя пытанні:

- 1919 год у жыцці сям'і Гарэцкіх.
- Віленскі перыяд жыцця Гарэцкіх.
- Горацкі перыяд у жыцці братоў Гарэцкіх.
- Педагагічная дзейнасць братоў Гарэцкіх.
- Публіцыстычная дзейнасць Максіма Гарэцкага.
- Аповець «Дзве душы»ў літаратурным і культурным кантэксце.
- Максім Гарэцкі і сучасны літаратурны працэс.
- Творы Максіма Гарэцкага ў сучасным адукацыйным працэсе.
- Гісторыя ўтварэння Беларускай акадэміі навук.
- Гаўрыла Гарэцкі – дырэктар Інстытута лясной і сельскай гаспадаркі.

Удзельнікі канферэнцыі мелі магчымасць праслухаць мастацкае чытанне ўрыўка з аповесці М. Гарэцкага «Дзве душы» ў выкананні рэжысёра і артыста Беларускага радыё А. Вінярскага.

Падчас працы канферэнцыі адбылася прэзентацыя матэрыялаў папярэдніх Гарэцкіх чытанняў (*Максім і Гаўрыла Гарэцкія. Жыццё і творчасць (прысвячаецца 125-годдзю з дня нараджэння Максіма Гарэцкага): матэрыялы XXVI Гарэцкіх чытанняў. – Мінск : РІВШ, 2018. – 166 с.*). Дадзенае выданне спрыяе вывучэнню і папулярызацыі ўнёску братоў Гарэцкіх у развіццё айчыннай навукі і мастацтва слова.

Даклады Т. Тарасавай («Міхась Мушынскі – маштабны даследчык творчай спадчыны Максіма Гарэцкага»), В. Губскай («Міхась Мушынскі – адзін з пачынальнікаў гарэцказнаўства»), Г. Кажамякіна («Міхась Мушынскі як даследчык жыцця і творчасці Максіма Гарэцкага») былі прысвечаны памяці доктара філалагічных навук, члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі М. Мушынскага. У дакладах адзначалася, што плён працы даследчыка на ніве гарэцказнаўства яшчэ доўгі час будзе прыцягваць увагу навукоўцаў, бо прапановы, зробленыя Міхасём Іосіфавічам пад час Гарэцкіх чытанняў, запрашаюць да роздуму, падказваюць шлях далейшага развіцця галіны (пераклады твораў М. Гарэцкага на мовы свету, выданне поўнага збору твораў мастака слова, які б не пакінуў «белых плям», дазволіўшы комплексна зірнуць на літаратурна-мастацкую, навуковую і грамадска-палітычную працу славутага беларуса).

Аповесць «Дзве душы» прыцягнула ўвагу чатырох дакладчыкаў. На матэрыяле аповесці Т. Вабішчэвіч акрэсліла сімптаматыку нацыянальнай траўмы, а А. Гурская разгледзела духоўна-маральны патэнцыял айчыннай літаратуры. Ю. Масарэнка прасачыла літаратуразнаўчыя ацэнкі аповесці за сто год. С. Сычова ў супастаўляльным плане даследавала вобраз беларуса ў згаданым творы М. Гарэцкага і п'есе Я. Купалы «Тутэйшыя».

Творчасць М. Гарэцкага стала аб'ектам кампаратыўных штудый у дакладах Д. Дудзінскай («Інтэнцыя самаацэнкі гісторыі культуры яе творцамі: Багдановіч, Гарэцкі, Каваленка, Алексіевіч, Быкаў»), А. Пахаленкава («"На империалистической войне" М. Горецкого и роман "потерянного поколения": пример сравнительного анализа»), Т. Супранковай («Сэнсавае напаўненне вобраза дзетазабойцы ў Ё.В. Гётэ і М. Гарэцкага: да пытання тыпалогіі»).

Асобна на канферэнцыі былі абмеркаваны пытанні прысутнасці спадчыны М. Гарэцкага ў сучасным айчынным адукацыйным працэсе (даклады А. Ермалінскай і І. Чарняўскай, А. Міхайлавай, К. Ермаковіч).

Канфэрэнцыя скончылася выступамі арганізатараў, якія падвялі вынікі працы і вызначылі перспектывы вывучэння спадчыны Гаўрылы і Максіма Гарэцкага. Удзельнікі ўсклалі кветкі да помніка М. Гарэцкаму.

***канд. філал. навук, дац. З.І. Трацця***к
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***